УДК 943.8.081

***Р.Р. Лазько***

# «ЦІСКІ» ЗМЫКАЮЦЦА: ПОЛЬСКАЕ ЗВЯНО ВЕРСАЛЬСКАЙ СІСТЭМЫ ПАМІЖ ГЕРМАНІЯЙ І СССР ВЯСНОЙ – ЛЕТАМ 1939 г.

Польска-германскі палітычны канфлікт, выкліканы адхіленнем Польшчай прапанаванай ёй Берлінам ролі сатэліта германскага рэйха, стаў цэнтральным кампанентам міжнароднага палітычнага крызісу, у якім Еўропа апынулася вясной 1939 г. З самага пачатку гэты канфлікт меў тэндэнцыю перарасці ў ваенную барацьбу, паколькі адзін з бакоў – Германія – не толькі не шукала яго вырашэння мірнымі сродкамі, але і абвастрала яго менавіта дзеля таго, каб у зручны момант выкарыстаць для развязвання вайны за сваё панаванне ў Еўропе. Гісторыя перарастання польска-германскага канфлікта ў барацьбу дзвюх ваенна-палітычных груповак сусветнага маштабу мае вялізную гістарыяграфію, якая працягвае інтэнсіўна развівацца. Аднак азнаямленне з беларускай літаратурай па гэтай праблеме дае падставы канстатаваць выпадзенне большасці публікацый беларускіх гісторыкаў з рэчышча развіцця сусветнай гістарыяграфіі. Імі не асвойваецца ні база крыніц, на якую абапіраецца сусветная гістарыяграфія, ні яе канцэптуальныя здабыткі (прадстаўленыя ў тым ліку ў найбольш даступных беларускім гісторыкам працах іх расійскіх калег). Такі стан айчыннай гістарыяграфіі стаў адным са стымулаў у выбары аўтарам тэмы гэтага артыкула. Пад «ціскамі» разумеецца прынцыпова негатыўнае стаўленне двух вялікіх суседзяў Польшчы як да польскага кампанента Версальскай сістэмы, так і да гэтай сістэмы ў цэлым. Пры гэтым зыходзім з таго, што змыканне савецка-германскіх геапалітычных ціскоў не было забяспечана аўтаматычна, яно было магчымае толькі ў пэўнай сітуацыі, абумоўленай як станам Версальскай сістэмы разам з яе польскім кампанентам, так і здольнасцю ціскоў дзейнічаць сінхронна, змыкацца.

Сутыкнуўшыся з грубым ціскам з боку Германіі ў сакавіку – красавіку 1939 г., Польшча не спыніла сваіх намаганняў вярнуць двухбаковыя адносіны на грунт раўнапраўнага абмеркавання існуючых спрэчных праблем. Важна пры гэтым адзначыць, што намаганні ў гэтым накірунку былі абмежаваны патрабаваннем, пастаўленым дзяржаўным кіраўніцтвам перад дыпламатыяй, каб пошукі міру з Германіяй не прывялі да капітуляцыі Польшчы [29, s. 529], як гэта адбылося з Чэхаславакіяй. Ілюзорнасць адпаведных спадзяванняў у польскім кіраўніцтве зразумелі занадта позна і дзейнічалі адпаведна з імі.

Аднак неабходна прызнаць, што аб’ектыўная сітуацыя пакідала Польшчы шанс на тое, каб пазбегнуць вайны. Справа ў тым, што хоць А. Гітлер у пачатку красавіка прыняў прынцыповае рашэнне аб нападзенні на Польшчу з мэтай яе разгрому, але ўмовы, у якіх фюрэр лічыў магчымым прыступіць да яго рэалізацыі, яшчэ неабходна было стварыць. Галоўнай з гэтых умоў, па меркаванні А. Гітлера, была ізаляцыя Польшчы. Падчас нарады з кіраўнікамі вермахта 23 мая фюрэр аргументаваў рашэнне пачаць вайну з нападзення на Польшчу дзвюма акалічнасцямі: неабходнасцю падрыхтаваць у выніку яе захопу эканамічную і стратэгічную апору для барацьбы з Захадам і прагназуемай ім актыўнай пазіцыяй Польшчы ў выпадку вайны на Захадзе. Паводле яго сцвярджэнняў, Польшча пастараецца не дапусціць перамогі Германіі над заходнімі дзяржавамі, бо бачыць у ёй небяспеку для сябе. На гэтай аснове рабілася прынцыповая ўстаноўка, адпаведна якой нападзенне на Польшчу «прывядзе да поспеху толькі ў тым выпадку, калі Захад застанецца па-за гульнёй» [5, с. 134].

На гэтай жа нарадзе А. Гітлер ставіў пытанне і аб пазіцыі СССР у будучай еўрапейскай вайне: «Не выключана, – заявіў ён, – што Расія пакажа сябе незацікаўленай у разгроме Польшчы». Гэтая фраза – «не выключана» – сведчыць, што больш верагоднай фюрэр лічыў іншую, супрацьлеглую пазіцыю СССР. Гэты яго асцярожны, але ап-

тымістычны прагноз абапіраўся на аналіз ідэйнай эвалюцыі сталінскага рэжыму ў накірунку расійскага вялікадзяржаўнага нацыяналізму, што стварала падставу для супадзення яго інтарэсаў у знешняй палітыцы з інтарэсамі Германіі – па меркаванні А. Гітлера, падставу больш трывалую, чым існаваўшая ў адносінах СССР з заходнімі дэмакратыямі [2, с. 37; 28, s. 12]. Роля СССР у будучай вайне цікавіла А. Гітлера яшчэ і з меркаванняў мабілізацыі эканамічных рэсурсаў для гэтай вайны [1, с. 25–26; 21, с. 72]. А «эканамічныя адносіны з Расіяй, – як было для яго відавочна, – магчымыя толькі пры паляпшэнні палітычных адносін» [5, с. 134]. Такім чынам, германская дыпламатыя мусіла накіраваць свае намаганні на ізаляцыю Польшчы як на Захадзе, так і на Усходзе.

Дзейнасць германскай дыпламатыі, накіраваная на ізаляцыю Польшчы ад яе саюзнікаў, добра вядомая з літаратуры. Гэта дазваляе нам абмежавацца канстатацыяй няўдачы прыкладзеных ёю вялізных намаганняў на заходнім накірунку. На працягу вясны – лета 1939 г. Англія і Францыя неаднойчы папярэджвалі Германію, што не адмовяцца ад саюзніцкіх абавязацельстваў перад Польшчай [18, с. 228, 232, 410], хоць і не страцілі надзеі пасадзіць абедзве дзяржавы за стол перагавораў аб Гданьску і польскім «калідоры». Германскае кіраўніцтва недааценіла першы элемент пазіцыі заходніх дзяржаў і значна пераацаніла другі, спадзеючыся на тое, што Англія задаволіцца падзелам сфер уплываў (вядома, часовым) і не ўступіць у вайну ў абарону Польшчы. Размаўляючы ў пачатку чэрвеня з камісарам Лігі нацый у Вольным горадзе К. Буркхартам, І. Рыбентроп выказаў прапанову, каб разглядаць гданьскую праблему ў шырокім каннтэксце, але адрасаваў яе не Варшаве, а Лондану. «Цяперашняя сітуацыя, – гаварыў ён, – з’яўляецца, пасутнасці, вынікам барацьбы за сферы ўплываў; гэта барацьба стала б беспрадметнай, калі б Германіі далі свабоду рук на Усходзе. Са свайго боку, Германія гатова даць Англіі свабоду рук у яе ўласнай сферы інтарэсаў» [27, s. 201]. 11 жніўня гэтую заяву таму ж К. Буркхарту паўтарыў А. Гітлер [27, s. 239–243]. Кожны раз яна своечасова даходзіла да адрасатаў: англійскага і французскага ўрадаў, – аднак спакусіць іх А. Гітлеру не ўдалося.

Вопыт, набыты кіруючымі коламі і грамадствам Англіі і Францыі да вясны 1939 г., сведчыў, наколькі небяспечна давяраць слову германскага канцлера. «Свабода рук» для Германіі на Усходзе пагражала падарваць пазіцыі Англіі як сусветнай дзяржавы, а непазбежным наступствам гэтай яе дэградацыі было б з’яўленне германскіх войск на берагах Ла-Манша. Знаўца праблемы германскі пасол у Лондане Г. фон Дзірксен, 18 жніўня папярэджваў свой урад, што Англія не застанецца нейтральнай, калі Германія пачне ваенныя дзеянні, пры гэтым яна будзе кіравацца не інтарэсамі Польшчы, а імкненнем захаваць сваё становішча ў свеце [7, с. 312–313]. Праз тыдзень, у самы крытычны момант германа-польскіх адносін, англійскі ўрад пацвердзіў слушнасць гэтай ацэнкі, падпісаўшы з Польшчай дагавор аб узаемнай дапамозе. У гэты ж дзень і французскі пасол Кулондр ад імя свайго ўрада папярэдзіў Гітлера, што Францыя выканае свае саюзніцкія абавязацельствы [31, p. 313–314].

У апошнія дні жніўня А. Гітлер працягваў дыпламатычныя манеўры, аднак не спыніўся перад рашэннем уступіць у вайну, нягледзячы на тое, што не набыў упэўненасці ў тым, што ваяваць давядзецца з адной Польшчай. «Прадказаць з поўнай выразнасцю» пазіцыю Англіі і Францыі, – гаварыў ён на нарадзе з вышэйшым генералітэтам 22 жніўня, – «немагчыма». Аднак «знішчэнне Польшчы застаецца на першым плане, нават калі пачнецца вайна на Захадзе» [5, с. 384]. Гітлер відавочна перамяніў сваю ацэнку англійскага і французскага фактара ў сваім рашэнні напасці на Польшчу за тры месяцы, што прайшлі пасля майскай нарады. Тады, як мы бачылі, ён разглядаў неўмя-

шанне Англіі і Францыі як неабходную ўмову для развязвання агрэсіі супраць Польшчы. А ў канцы жніўня перспектыва вайны адначасова супраць Захаду і Польшчы яго ўжо не спыніла.

Натуральна ўзнікае пытанне: чым была выклікана такая перамена? Асобныя расійскія і заходнія аўтары [18, с. 359–360] падтрымліваюць версію, адпаведна якой Гітлер праігнараваў папярэджанні Англіі і Францыі, атрымаўшы звесткі, што Францыя не будзе весці наступальных дзеянняў, пакуль на яе тэрыторыю не ўступіць брытанскі экспедыцыйны корпус. Аб яго стварэнні дзве дзяржавы дамовіліся вясной 1939 г., а яго першыя 7 дывізій Англія планавала ўвесці ў дзеянне вясной 1940 г. Гэта версія не выглядае пераканаўчай, хаця, безумоўна, прымаючы рашэнне аб развязванні вайны, Гітлер улічваў гатоўнасць Англіі і Францыі да наступальных дзеянняў. Аднак 23 мая, калі ён абумовіў сваё рашэнне аб нападзенні на Польшчу яе ізаляцыяй ад заходніх саюзнікаў, брытанскага экспедыцыйнага корпуса наогул не было, а сухапутныя войскі Англіі складаліся ўсяго з 5 дывізій, што мелі задачу аб абароне вострава. Што ж да Францыі, то з часоў будаўніцтва «лініі Мажыно» прынятая ёю абарончая стратэгія не мянялася, што пацвердзілі англа-французскія штабныя перагаворы вясной 1939 г. [34, s. 44; 33, s. 281]. Калі Гітлер на працягу лета 1939 г. атрымаў звесткі, што Францыя не збіраецца весці наступальных дзеянняў без удзелу ў іх англійскіх войск на французскай тэрыторыі, то тым самым ён атрымаў пацвярджэнне, што Францыя не змяніла сваю ранейшую, усім вядомую абарончую стратэгію, а яе абяцанне Польшчы, зафіксаванае на штабных перагаворах у маі 1939 г. – простая фікцыя [25, s. 176–179; 35, s. 437]. Аднак гэтая інфармацыя не давала падстаў разлічваць на тое, што Англія і Францыя наогул не ўмяшаюцца ў вайну. Яна сведчыла толькі аб тым, што гэтыя дзяржавы арыентуюцца на працяглую вайну. Калі Гітлер баяўся яе ў маі 1939 г. (хаця і не выключаў), то чаму ж перастаў баяцца ў канцы жніўня?

Адказ знаходзім у гітлераўскай трактоўцы пытання аб пагрозе блакады Германіі яе заходнімі праціўнікамі. На нарадзе 23 мая ён патлумачыў, што не можа прыняць ад заходніх дзяржаў «падачкі» ў выглядзе калоній, бо валоданне імі не здымае гэтай пагрозы [5, с. 133]. Да 22 жніўня сітуацыя змянілася: пасля падпісання гандлёва-крэдытнага пагаднення з СССР было абвешчана, што І. Рыбентроп у бліжэйшы час адправіцца ў Маскву, каб падпісаць дагавор аб ненападзенні. Сэнс гэтага дагавора, у кантэксце інтарэсаў Германіі, А. Гітлер патлумачыў так: «Я ў бліжэйшыя тыдні на (будучай! – Р. Л.) савецка-германскай граніцы падам руку Сталіну і разам з ім прыступлю да новага падзелу свету...» Пагроза блакады ўжо не палохала яго: «Няшчасныя чарвякі – Даладзье і Чэмберлен… не змогуць ажыццявіць блакады. Наадварот, у нас ёсць наша аўтаркія і руская сыравіна». Фюрэр далей удакладніў: «Мы не павінны баяцца блакады. Усход пастаўляе нам збожжа, жывёлу, вугаль, свінец, цынк» [12, с. 91–96; 20, с. 281–282]. Гэта было галоўнае, бо нягледзячы на здзеклівыя характарыстыкі Чэмберлена і Даладзье, Гітлер атакі з Захаду не выключаў, аб чым сведчыць і яго дырэктыва №1 на вядзенне вайны ад 31 жніўня [5, с. 385–386].

Такім чынам, падпісанне савецка-германскіх пагадненняў кардынальна мяняла стратэгічную сітуацыю – паляпшала яе для Германіі і адпаведна пагаршала для Польшчы. Гэты паварот быў настолькі важны для ажыццяўлення гітлераўскіх планаў, што на працягу вясны – лета 1939 г. Гітлер неаднойчы ставіў іх у залежнасць ад магчымасці здзяйснення названага павароту. Гэта важна падкрэсліць, бо ў беларускай гістарыяграфіі выказваюцца меркаванні, у якіх выключаецца альтэрнатыўнасць развіцця палітычнай сітуацыі ў Еўропе пасля зацвярджэння Гітлерам 11 красавіка Дырэктывы

аб адзінай падрыхтоўцы да вайны, якая ўключала план «Вайс». Гітлер імкнуўся дасягнуць паразумення з СССР, бо вымушаны быў прыслухоўвацца да меркавання сваіх генералаў – Кейтэля, Браухіча. Апошні, напрыклад, сказаў фюрэру, што Германія пацерпіць паражэнне, калі СССР выступіць на баку Польшчы і заходніх дзяржаў [15, с. 273]. Пад уплывам інфармацыі аб польска-англійскім часовым пагадненні, падпісаным у пачатку красавіка, Гітлер заявіў у эмацыянальным парыве, што наступным яго крокам будзе афіцыйны візіт у Маскву [26, s. 27], – натуральна, дзеля таго, каб перахапіць СССР, які стаў на шлях перагавораў з Англіяй і Францыяй. Гэтыя перагаворы вельмі трывожылі фюрэра. Дзяржсакратар МЗС Э. Вайцзекер, іншыя супрацоўнікі МЗС – Э. Кордт, В. Хевель (прадстаўнік І. Рыбентропа пры рэйхсканцлеры), начальнік штаба сухапутных войск генерал Гальдэр, спасылаючыся на інфармацыю, што ішла непасрэдна ад Гітлера, сцвярджалі, што фюрэр збіраўся адмовіцца ад нападзення на Польшчу ў выпадку заключэння дагавора паміж СССР, Англіяй і Францыяй [15, с. 273–274]. Такое ж перакананне склалася ў паслоў Англіі і Францыі ў Берліне [14, с. 123; 15; 26]. У сярэдзіне лета Гітлер сцвярджаў, што калі будзе заключаны саюз паміж Захадам і СССР, то ён адмовіцца ад выступлення супраць Польшчы і чарговы партыйны з’езд у верасні правядзе пад лозунгам міру. Калі ж англічане і французы вернуцца з Масквы з пустымі рукамі, то ён разаб’е Польшчу, не баючыся канфлікту з Захадам [26, s. 27].

Характэрна, што ў Крамлі ўжо ў другой палове мая зарыентаваліся ў тым, якое рашаючае значэнне Гітлер надае пагадненню з СССР пры падрыхтоўцы агрэсіі супраць Польшчы. Тут па каналах разведкі з гданьскага сената і германскага пасольства ў Варшаве былі атрыманы звесткі па гэтым пытанні. Старшыня гданьскага сената А. Грэйзер, які меў пастаянныя кантакты з германскім кіраўніцтвам у Берліне, сказаў свайму супрацоўніку, што «для ваеннага вырашэння канфлікта з Польшчай Гітлер выбера такі час, калі знешнепалітычнае становішча Германіі будзе спрыяльным. Зараз гэта не так… Для нас рашаючае значэнне мае ў першую чаргу пазіцыя Савецкага Саюза» [16, с. 400, 415]. Гэтая інфармацыя дазволіла І. Сталіну зразумець, наколькі высока ўзняліся палітычныя акцыі СССР у падзеях, якія разгортваліся ў Еўропе. Ключавая сітуацыя СССР давала яму магчымасць весці перагаворы з абодвума бакамі, што рыхтаваліся да вайны, праяўляючы стрыманасць і патрабавальнасць, каб у адпаведны момант зрабіць свой выбар. Безумоўна, выбар няпросты, бо з тых жа данясенняў разведкі было відавочна, што на трэцім этапе, пасля разгрому Польшчы і вайны на Захадзе, Гітлер збіраецца напасці на СССР. Але ж гэты этап мог і не наступіць пры ўмелай палітыцы савецкай дзяржавы, якая абапіралася на сфармуляваны яшчэ У. Леніным дактрынальны прынцып аб выгаднасці для Савецкай Расіі сутыкненняў паміж капіталістычнымі групоўкамі, аб неабходнасці нават правакаваць іх, каб у зручны момант «схапіць капіталізм за каўнер» [11, с. 58–59, 61, 66; 10, с. 389]. Гэтай пазіцыі няўхільна трымаліся ўсе спадкаемцы Леніна. Яшчэ з часу сваёй барацьбы за лідарства ў гэтай групе Сталін пастаянна даводзіў сваім таварышам, што СССР уступіць у вайну, але ўступіць апошнім, «каб кінуць вырашальную гіру на шалі» барацьбы. А да таго моманту яго задача – падштурхоўваць капіталістычныя групоўкі адна супраць другой, «каб добра пабіліся [17, с. 14; 19, с. 18]». У Варшаве не зразумелі гатоўнасці СССР у крызіснай сітуацыі 1939 г. дзейнічаць адпаведна з гэтым прынцыпам і не заўважылі яго вырасшай здольнасці дзейнічаць менавіта гэтакім чынам. Захаванню Польшчай да апошняга моманту яе палітыкі «раўнавагі» паміж Германіяй і СССР садзейнічала тая дыпламатычная гульня, якую павёў у адносінах да яе савецкі ўрад. У свой час у наркама замежных спраў СССР М. Літвінава існавалі падазрэнні, што міністр замежных спраў Польшчы Ю. Бек,

атрымаўшы англійскія гарантыі, зможа дасягнуць «здзелкі» з А. Гітлерам па пытанні аб Данцыгу і калідоры за кошт Літвы і (магчыма) іншых краін Прыбалтыкі [3, с. 371]. Аднак далейшае абвастрэнне польска-германскіх адносін выявіла неактуальнасць гэтых падазрэнняў. Новы савецкі наркам В. Молатаў 8 мая 1939 г. перадаў праз польскага пасла В. Гжыбоўскага віншаванні Ю. Беку ў сувязі з яго цвёрдым патрыятычным выступленнем у сейме, якое было адказам на разрыў Германіяй дэкларацыі аб непрымяненні сілы 1934 г. Тым самым наркам як бы запрашаў падтрымліваць кантакты паміж дзвюма дзяржавамі ў антыгерманскім духу. Бек адгукнуўся, выказаўшы жаданне сустрэцца з намеснікам наркама Пацёмкіным, які вяртаўся з Турцыі і Румыніі праз Варшаву. Молатаў дазволіў Пацёмкіну гэту сустрэчу і вызначыў яе мэту: «Галоўнае для нас – даведацца, як у Польшчы ідуць справы з Германіяй» [6, с. 352]. Характэрна, што савецкага кіраўніка цікавіла толькі гэтае пытанне, хаця ў размове з Гжыбоўскім 8 мая ён дамагаўся тлумачэнняў негатыўных адносін польскага ўрада да асобных пунктаў савецкіх прапаноў урадам Англіі і Францыі ад 17 красавіка, вакол якіх ішлі перагаворы трох дзяржаў. Меліся на ўвазе пажаданні савецкага ўрада, каб англійскі ўрад дакладна зарыентаваў супраць Германіі абвешчаныя ім гарантыі Польшчы, і каб польска-румынскі дагавор 1921 г. быў накіраваны супраць любой патэнцыяльнай агрэсіі або быў адменены як антысавецкі [16, с. 336–337, 379–380].

Гісторыкамі з краін на ўсход ад Польшчы пры разглядзе пытання аб сустрэчы Пацёмкіна з Бекам звычайна цытуецца адзін дакумент – кароткая тэлеграма намесніка наркама ў Маскву аб выніках гэтай сустрэчы. Пацёмкін «атрымаў некаторую інфармацыю аб стане польска-германскіх адносін. Шляхам падрабязнага аналізу суадносін сіл у Еўропе і магчымасцей эфектыўнай франка-англійскай дапамогі Польшчы прывёў Бека да прамога прызнання, што без падтрымкі СССР палякам сябе не адстаяць». Адпаведна з даручэннем Молатава Пацёмкін таксама «падкрэсліў, што СССР не адмовіў бы ў дапамозе Польшчы, калі б яна гэтага пажадала» [16, с. 389].

Паколькі вынікі перагавораў Пацёмкіна ў Варшаве сталі адной з істотных асноў для фарміравання курсу савецкай палітыкі адносна Польшчы ў наступныя месяцы, звернемся да польскіх дакументаў, якія даюць аб іх больш поўнае ўяўленне. У справаздачы з польскага боку пазіцыя намесніка наркама на перагаворах выглядае не такой цвёрдай, як у яго тэлеграме. Ён «праяўляў тэндэнцыю» схіліць Польшчу да прыняцця дагавора з СССР, але адначасова «выказваў разуменне» польскіх контраргументаў супраць яго. Такімі контраргументамі былі адсутнасць у Польшчы магчымасцей аказаць СССР дапамогу на аснове ўзаемнасці і яе нежаданне паўтараць «памылкі» мінулага года, калі гвалтоўным дзеянням Германіі процідастаўляліся толькі дэкларацыі. Пацёмкін зразумеў і заяву аб нежаданні псаваць адносіны з Венгрыяй як аргумент Польшчы супраць расшырэння саюза з Румыніяй. Важнейшым момантам у ходзе перагавораў быў яго адказ на пытанне, пастаўленае Бекам – аб пазіцыі СССР у выпадку агрэсіі Германіі супраць Польшчы. Пацёмкін, са спасылкай на атрыманыя ад урада паўнамоцтвы, заявіў, што яна будзе «прыязнай» [24, l. 79–80]. Ён нічым не абгрунтаваў гэтую пазіцыю.

Ю. Бек зразумеў вынікі перагавораў як цалкам станоўчыя для Польшчы. Яго задаволілі і вынікі чарговай размовы Гжыбоўскага з Молатавым (11 мая), у якой пасол перадаў афіцыйную трактоўку польскай пазіцыі адносна савецкіх прапаноў ад 17 красавіка. У гэтай трактоўцы паўтараўся тэзіс, выказаны Пацёмкіну, аб прымальнасці для Польшчы толькі пагадненняў на аснове ўзаемнасці і выказвалася заўвага, што польскі ўрад не даручаў ураду Францыі весці перамовы з савецкім урадам па пытаннях савецка-польскіх адносін, якія могуць вырашацца толькі непасрэдна паміж Масквой

і Варшавай [24, l. 82; 16, с. 393–394]. На падставе гэтага высвятлення пазіцый 13 мая Ю. Бек разаслаў дыпламатычным прадстаўніцтвам цыркуляр, у якім пісаў, што «савецкі ўрад выказвае разуменне нашага погляду на польска-савецкія адносіны, якія цяпер развіваюцца цалкам нармальна. Саветы разумеюць, што ўрад Польшчы не схільны ўдзельнічаць у якім-небудзь дагаворы з адным з вялікіх суседзяў Польшчы, накіраваным супраць другога, і разумее карысць, якая выцякае з такой яго пазіцыі». Далей міністр паведамляў аб заяве Пацёмкіна, зробленай па даручэнні савецкага ўрада, аб прыязным стаўленні СССР да Польшчы ў выпадку германскай агрэсіі супраць яе [24, l. 77]. Такім чынам, у разуменні Бека, савецкі ўрад падтрымаў тагачасную лінію польскай знешняй палітыкі. Польскі міністр не зразумеў галоўнага – савецкі ўрад пакідае ў сваіх руках ключ да рашэння Германіі аб нападзенні на Польшчу і яе разгроме.дзякуючы майскім (1939 г.) кантактам Молатава і пацёмкіна з іх польскімі калегамі савецкім кіраўніцтвам было бясспрэчна ўстаноўлена, што Польшча не вядзе і не збіраецца весці капітулянцкіх перамоў з Германіяй, яна не мяняе сваёй пазіцыі адносна супрацоўніцтва з СССР, хаця і не выключае яго ўмацавання ў будучым. «Польшча, – адзначаў В. Молатаў, – не хоча ў цяперашні момант звязваць сябе якім-небудзь пагадненнем з СССР або згодай на ўдзел СССР у гарантаванні Польшчы, але не выключае апошняга ў будучым» [16, с. 393].

Тым часам 20 мая 1939 г. германскі пасол у Маскве граф Шуленбург прыступіў да выканання даручэння Гітлера аб падрыхтоўцы грунту для савецка-германскага палітычнага пагаднення [20, с. 149–150, 156–158]. Гэта азначала, што Масква атрымала другі канал (пасля лонданска-парыжскага) палітычных перагавораў, звязаных з агрэсіўнымі планамі Германіі. У гэтай сітуацыі савецкі ўрад вырашыў яшчэ раз празандзіраваць пазіцыю Польшчы, заахвочваючы яе да перагавораў аб верагоднай савецкай дапамозе. Гэтая новая спроба магла застацца звычайным зандажам, але ў выпадку яе поспеху яна была здольнай у пажаданым накірунку паўплываць на перагаворы СССР з заходнімі дзяржавамі. Яе ажыццявіў новы савецкі пасол у Варшаве Шаронаў у час першай сустрэчы з Бекам 25 мая, калі напомніў яму аб гатоўнасці СССР дапамагаць. «Каб дапамагчы заўтра, – заявіў пасол, – трэба быць гатовымі сёння, гэта значыць, загадзя ведаць аб неабходнасці дапамагаць» [8, с. 111–112]. В. Гжыбоўскі, не называючы дакладнай даты, таксама сведчыць, што недзе ў той жа час В. Молатаў перасцярог яго аб тым, што польскі ўрад можа спазніцца са сваім зваротам да СССР за дапамогай. Гжыбоўскі паслаў у Варшаву ваеннага аташэ з рапартам аб гэтай размове і атрымаў адказ: «Будзьце спакойныя, час яшчэ не наступіў, рашэнне мы прымем своечасова» [30, s. 97].

Адзінай прыкметай (хоць, безумоўна, істотнай) змянення польскай усходняй палітыкі было даручэнне Ю. Бека В. Гжыбоўскаму дамагацца заключэння пагаднення з СССР аб транзіце з Захаду ваенных матэрыялаў праз савецкую тэрыторыю. Аднак ужо 9 чэрвеня перагаворы былі спынены савецкім урадам, нягледзячы на тое, што Гжыбоўскі стараўся падкрэсліць значэнне іх паспяховага завяршэння для арганізацыі Польшчай адпору агрэсару. Пацёмкін заявіў паслу, што пытанне аб транзіце польскім урадам пастаўлена заўчасна, бо яшчэ не ясная перспектыва заключэння дагавора «міралюбівых дзяржаў» аб супрацьдзеянні агрэсіі [6, с. 451; 32, s. 105]. Відавочна, што савецкае кіраўніцтва ў гэтым выпадку адхіліла спробу Польшчы вывесці пытанне аб транзіце і пастаўцы ваенных матэрыялаў па-за межы англа-франка-савецкіх перагавораў у сферу чыста гандлёвых адносін. Гэта азначала таксама, што савецкі ўрад не прыняў ролю як бы зарэзерваванай да часу тылавой базы, якая адводзілася СССР у польскай палітычнай стратэгіі, і захаваў вольныя рукі ў адносінах з Германіяй.

Савецкае кіраўніцтва разлічвала на больш значную ролю ў наспяваўшых падзеях. Маючы дастатковую інфармацыю аб развіцці польска-германскага канфлікту і звязаных з ім пазіцыях заходніх дзяржаў, яно мела магчымасць цвёрда патрабаваць ад сваіх партнёраў уліку інтарэсаў СССР у еўрапейскім крызісе. Як заявіў В. Молатаў 31 мая на сесіі Вярхоўнага Савета, «СССР цяпер не той, якім ён быў, скажам, у 1921 г.» і нават 5–10 гадоў назад: «сілы СССР узмацніліся». «Даводзіцца аб гэтым напомніць, – падкрэсліў наркам, – бо да гэтага часу нават некаторыя нашы суседзі, мабыць, не могуць гэтага зразумець» [3, с. 530].

Летам 1939 г. савецкае кіраўніцтва ўпэўнілася, што задаволіць інтарэсы СССР, у сталінскім іх разуменні, магчыма дзякуючы супрацоўніцтву з германіяй, а не з дэмакратычнымі дзяржавамі – саюзнікамі Польшчы. Сярод гэтых інтарэсаў на адным з першых месц было ўстанаўленне кантролю СССР над Прыбалтыкай. Сталін пазней прызнаў, што перагаворы з урадам Чэмберлена «праваліліся якраз на пытанні прыбалтыйскіх краін і Фінляндыі» [9, с. 23]. Ён спадзяваўся ў ходзе перагавораў з Англіяй і Францыяй атрымаць згоду гэтых дзяржаў на самастойныя дзеянні СССР адносна ўсходнееўрапейскіх краін у выпадку як прамой, так і ўскоснай агрэсіі супраць іх. Ускосная агрэсія разумелася як «унутраны пераварот або паварот у палітыцы (гэтых краін – Р.Л.), каб дагадзіць агрэсару» [7, с. 130]. На практыцы гэта азначала б, што «дапамога» названым краінам з боку СССР магла быць аказана нават без іх згоды. Не дзіўна, што на такую дапамогу не згаджаліся ні краіны Прыбалтыкі [6, с. 449, 505–506, 545– 546;13, с. 4, 43, 47, 51], ні Польшча [8, с. 120–121].

Не падтрымалі СССР у гэтым пытанні і яго заходнееўрапейскія партнёры па перагаворах. У той жа час гітлераўскае кіраўніцтва Германіі, не абмежаванае якімі-небудзь маральнымі комплексамі, і зыходзячы з імкнення адасобіць СССР ад заходніх дзяржаў, прапанавала Сталіну праграму, якая ішла значна далей таго, што ў геапалітычных адносінах СССР спадзяваўся атрымаць пры супрацоўніцтве з краінамі Захаду. Гэта была праграма тэрытарыяльных змен ва Усходняй Еўропе на карысць СССР і Германіі. 3 жніўня І. Рыбентроп заявіў часоваму паверанаму ў справах СССР у Германіі Г. Астахаву, што «супярэчнасцей паміж нашымі краінамі няма на ўсёй прасторы ад Чорнага мора да Балтыйскага. Па ўсіх гэтых пытаннях можна дамовіцца» [4, с. 158]. Перагаворы хутка набылі характар абмеркавання канкрэтных пытанняў. Не хаваючы таго, што яны ставяцца ў сувязі з намерам Германіі развязаць вайну, гітлераўскі ўрад заяўляў аб незацікаўленасці лёсам Прыбалтыкі (акрамя Літвы), былой «рускай Польшчы», Бесарабіі, Украіны. Адпаведна з рашэннем Палітбюро ЦК УКП(б) 11 жніўня Молатаў паслаў Астахаву тэлеграму, у якой даручыў паведаміць аб жаданні савецкага ўрада весці перагаворы па ўсіх пытаннях, а месцам іх правядзення прапанаваў Маскву [4, с. 180, 184] (англа-франка-савецкія перагаворы ваенных місій пачаліся толькі на наступны дзень). 15 жніўня Шуленбург уручыў Молатаву памятную запіску германскага ўрада з просьбай далажыць яе Сталіну, у якой намячаліся контуры будучай дамовы і выказвалася прапанова аб прыездзе ў Маскву Рыбентропа для яе падпісання [4, с. 232–233]. Праз два дні Германія павысіла плату за неабходны ёй дагавор, згадзіўшыся аказаць уплыў на Японію дзеля нармалізацыі савецка-японскіх адносін [4, с. 230–231, 271].

Вынікам інтэнсіўных савецка-германскіх перагавораў з’явіўся дагавор аб ненападзенні ад 23 жніўня 1939 г. з сакрэтным дадатковым пратаколам як яго арганічнай часткай. У пратаколе фіксаваўся падзел сфер інтарэсаў паміж СССР і Германіяй, што разумелася як падзел сфер тэрытарыяльнай экспансіі. Лінія размежавання інтарэсаў на тэрыторыі Польшчы праводзілася па рэках Нараў, Вісла і Сан. Канчатковы лёс

польскай дзяржавы Германія і СССР дамовіліся вырашыць пазней на аснове «дружалюбнай узаемнай згоды» [4, с. 321].

Згода савецкага ўрада на падпісанне дагавора з Германіяй зрабіла беспрадметнымі англа-франка-савецкія перагаворы аб супрацьдзеянні агрэсару. 21 жніўня адбылося апошняе пасяджэнне ваенных місій. Асобныя беларускія гісторыкі і сёння следам за савецкай гістарыяграфіяй тлумачаць зрыў перагавораў нязгодай Польшчы на пропуск савецкіх войск праз яе тэрыторыю для барацьбы з агрэсарам. Але ж савецкаму ўраду гэта пазіцыя Польшчы была вядомая задоўга да таго, як у Маскве 12 жніўня пачаліся перагаворы ваенных місій, яшчэ з часу перагавораў аб стварэнні сістэмы калектыўнай бяспекі ў сярэдзіне 1930-х гадоў. Тым не менш, да пачатку маскоўскіх перагавораў ён не ставіў гэта пытанне перад сваімі партнёрамі, нягледзячы на тое, што яно патрабавала свайго абмеркавання менавіта ў палітычнай плоскасці – і як пытанне, якому сам жа савецкі ўрад надаваў кардынальнае значэнне для поспеху перагавораў, і як пытанне, што адносілася да суверэнітэта суседняй дзяржавы. Упершыню ад пачатку крызісу 1939 г. пытанне аб праходзе савецкіх войск праз тэрыторыю Польшчы і Румыніі было сфармулявана 4 жніўня ў дакуменце савецкага генеральнага штаба, у якім разглядаліся варыянты магчымых дзеянняў савецкіх узброеных сіл у выпадку агрэсіі супраць Англіі, Францыі, Польшчы або Румыніі. На аснове гэтага дакумента І. Сталін 7 жніўня зацвердзіў інструкцыю савецкай дэлегацыі для вядзення ваенных перагавораў. У абодвух дакументах згода на пропуск савецкіх войск праз тэрыторыю Польшчы і Румыніі разглядалася як папярэдняя ўмова паспяховага правядзення перагавораў [4, с. 168–174; 6, с. 386–387, 584]. Аднак нават у апошнія дні перад іх пачаткам адпаведнае пытанне не было накіравана ні ўрадам Англіі і Францыі, ні тым болей польскаму ўраду. Такім чынам, патрабаванне пропуску савецкіх войск было зарэзервавана савецкім кіраўніцтвам для выкарыстання ў залежнасці ад акалічнасцей у адной з двух яго патэнцыяльных функцый: як сродак рашучага націску на Англію і Францыю або як сродак магчымага зрыву перагавораў. Фактычна яно было ўжыта дзеля гэтай другой мэты, тады, калі стала ясна, што Германія гатова далёка пайсці насустрач СССР у задавальненні экспансіянісцкіх планаў сталінскага кіраўніцтва.

1 верасня 1939 г. польска-германскія «цыскі» былі прыведзены ў дзеянне. Пачалася вайна, якую былі няздольныя перажыць ні Версальская сістэма ў цэлым, ні Польшча ў яе статусе звяна гэтай сістэмы. Польскі ўрад намагаўся прадухіліць уцягванне краіны ў вайну, аднак яго намаганні ішлі толькі ў заходніх накірунках і па гэтай прычыне былі недастатковыя для дасягнення мэты. Летам 1939 г. пагроза змыкання германа-савецкіх геапалітычнай «цыскоў» не была заўважана ў Варшаве.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Безыменский, Л.А. Советско-германские договоры 1939 г.: новые документы и старые проблемы / Л.А. Безыменский // Новая и новейшая история. – 1998. – № 3.

2. Гинцберг, Л.И. Советско-германский пакт: замысел и его реализация / Л.И. Гинцберг // Отечественная история. – 1996. – № 3.

3. Год кризиса, 1938–1939 : Документы и материалы : в 2 т. – Т. 1: 29 сентября 1938 г. – 31 мая 1939 г. / М-во иностр. дел СССР. – М. : Политиздат, 1990.

4. Год кризиса, 1938–1939 : Документы и материалы : в 2 т. – Т. 2: 2 июня 1939 г. – 4 сентября 1939 г. / М-во иностр. дел СССР. – М. : Политиздат, 1990.

5. Дашичев, В.И. Банкротство стратегии германского фашизма. Исторические очерки. Документы и материалы / В.И. Дашичев. – М. : Наука, 1973. – Т. 1.

6. Документы внешней политики. 1939 год. – М. : Междунар. отношения, 1992. – Т. 22. – Кн. 1.

7. Документы и материалы кануна второй мировой войны. 1937–1939. – Т. 2: Янв.–авг. 1939 г. / М-во иностр. дел СССР. – М. : Политиздат, 1981.

8. Документы и материалы по истории советско-польских отношений. – Т. 7: 1939 – 1943 гг. – М. : Наука, 1973.

9. Запись переговоров между министром иностранных дел Великобритании Антони Иденом и (г-ном И.В.) Сталиным ночью 17 декабря (1941) // Родина. – 1991. – № 6–7.

10. Ленин, В.И. Неизвестные документы. 1891–1922 / В.И. Ленин. – М., 1999.

11. Ленин, В.И. Полн. собр. соч. / В.И. Ленин. – Т. 42.

12. Откровения и признания: нацистская верхушка о войне «третьего рейха» против СССР. Секретные речи. Дневники. Воспоминания. – М. : «Терра», 1996.

13. От пакта Молотова–Риббентропа до договоров о базах. Документы и материалы. – Таллинн, 1990.

14. Семиряга, М.И. Ещё раз о кризисном годе, 1939… // Мировая экономика и международные отношения. – 1989. – № 12.

15. Сиполс, В.Я. Дипломатическая борьба накануне второй мировой войны / В.Я. Сиполс. – М. : Международ. отношения, 1979.

16. СССР в борьбе за мир накануне второй мировой войны. Сентябрь 1938 г. – август 1939 г. – М. : Политиздат, 1971.

17. Сталин, И.В. Сочинения / И.В. Сталин. – М., 1947. – Т. 7.

18. 1939 год. Уроки истории. – М. : Мысль, 1990.

19. Фирсов, Ф.И. Архивы Коминтерна и внешняя политики СССР в 1939–1941 гг. / Ф.И. Фирсов // Новая и новейшая история. – 1992. – № 6.

20. Фляйшхауэр, И. Пакт. Гитлер, Сталин и инициатива германской дипломатии. 1938–1939 г.; пер. с нем. И. Фляйшхауэр. – М. : Прогресс, 1990.

21. Фолькман, Г.-Э. Польша в политико-экономических расчётах «третьего рейха» / Г.-Э. Фолькман // Вторая мировая война. Дискуссии. Основные тенденции. Результаты исследований. – М. : Весь мир, 1996.

22. Цительман, Р. К обоснованию мотива «жизненного пространства» в мировоззрении Гитлера / Р. Цительман / Вторая мировая война. Дискуссии. Основные тенденции. Результаты исследований. – М. : «Весь ми», 1996.

23. Ширер, У. Взлёт и падение Третьего Рейха / У. Ширер. – М. : Воениздат, 1991. – Т. 1.

24. Archiwum Akt Nowych (Warszawa). MSZ. Wydział Wschodni. – Sygn. 6652A.

25. Bellona. – L., 1958. – Zesz. 2–4.

26. Bregman, A. Najlepszy sojusznik Hitlera. – Warszawa, 1997 (Сведчанне супрацоўніка германскага МЗС Э. Кордта, пачутае ад генерала Браўхіча).

27. Burckhardt, C.J. Moja misja w Gdańsku. 1937–1939 / C.J. Burckhardt. – Warszawa : Pax, 1970.

28. Dębski, S. Pakt Ribbentrop–Mołotow a sowiecka agresja na Polskę 17 września 1939 r. / S. Dębski // Radziecka agresja 17 września 1939 r. i jej skutki dla mieszkańców ziem północno-wschodnich II Rzeczypospolitej. – Białystok, 2000.

29. Diariusz i teki Jana Szembeka (1935–1945) : w 4 t. / Polski osrodek naukowy. – L., 1972. – T. 4.

30. Diariusz i teki Jana Szembeka (1935–1945). Uzupełnienia od 1 września do 31 grudnia 1939 r. // Niepodległość. – N.-Y.; L., 1987. – T. XX.
31. Documents diplomatiques. 1938–1939. – Paris : Imprimerie Nationale, 1939.
32. Grzybowski, W. Byłem świadkiem / W. Grzybowski. – B. m., 1984.
33. Karski, J. Wielkie mocarstwa wobec Polski. 1919–1945 / J. Karski. – Warszawa : PIW, 1992.
34. Kowalski, W.T. Zachodni sojusznici Polski wobec niemieckiej agresji na Polskę / W.T. Kowalski // Wojskowy przegląd historyczny. – 1989. – № 3.
35. Zgórniak, M. Europa w przededniu wojny / M. Zgórniak. – Krakow : Ksiegarnia Akademicka, 1993.

***Lazko R.R.* «Grips» are Tightening: Polish Section of Versailles System between Germany and USSR in Spring-Summer of 1939**

Assessing the position of Poland between two anti-Versailles states- fascist Germany and the USSR – in the situation of geopolitical «grips», the author considers the conditions in which their linking turned out to be possible in early autumn of 1939.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 03.10.2012